## ■ Вернісаж

# Форма пункту гледжання

### Новая «маладая» экспазіцыя адной з найцікавейшых выставачных пляцовак Мінска

**Цэнтр сучасных мастацтваў, што на Някрасава, не так даўно запусціў праект White Room. Гэта асобная прастора ў сценах будынка цэнтра, якая прапануе супрацоўніцтва маладым людзям, што хочуць паказаць публіцы сваю творчасць. Мастакі, фатографы, дызайнеры, прадстаўнікі розных напрамкаў contemporary art могуць дасылаць свае партфоліа куратарам праекта і разлічваць на пляцоўку, дзе будуць мець магчымасць бясплатна выстаўляцца на працягу месяца.**

Першым мерапрыемствам праекта White Room яшчэ ў маі стала персанальная фотавыстава Лесі Пчолкі. А ў сярэдзіне ліпеня ў НЦСМ адкрылася ўжо другая экспазіцыя White Room, якую можна паглядзець і сёння, — праект «Хваля» мастачкі Ханны Мурайды.

Для сферы культуры фармат White Room — даволі даступны і «дэмакратычны» — павінен стаць у нейкім сэнсе жыватворным. Цэнтр сучасных мастацтваў за свой пакуль нядоўгі тэрмін існавання стаў важнай пляцоўкай у беларускай артпрасторы, і такі крок насустрач аўтарам выглядае цалкам лагічным і прадказальным працягам яго дзейнасці. Цэнтр шчыра вітае і падтрымлівае маладых творцаў у сучасным мастацтве. Калі буйная ўстанова кшталту НЦСМ так відавочна акрэслівае сваю палітыку ў дачыненні да тых, хто знаходзіцца на пачатку творчага шляху, гэта можна лічыць тэндэнцыяй.

White Room у пэўным сэнсе адмяняе традыцыйныя складанасці і паказвае, што выставіцца можна, і лягчэй, чым думаецца. Прыемная перспектыва для маладых — на выгадных умовах паказаць сябе на адной з самых вядомых мінскіх пляцовак. Тым не менш якасны адбор, вядома ж, прысутнічае, а гэта ўжо азартны складнік, і, гледзячы на тых дзвюх аўтарак, якія змаглі паўдзельнічаць у White Room, персанальныя выставы ў НЦСМ не сталі для іх першым выхадам у свет.

**Калі буйная ўстанова кшталту НЦСМ так відавочна акрэслівае сваю палітыку ў дачыненні да тых, хто знаходзіцца на пачатку творчага шляху, гэта можна лічыць тэндэнцыяй.**



Ханна Мурайда некалі была Ганнай Бацюковай. Скончыла Акадэмію мастацтваў у Мінску, потым з'ехала вучыцца ў Германію, цяпер жыве і працуе ў Аўстрыі. Калі за мяжой беларускае імя Ганна перайначылі на Ханну, аўтарка ўзяла псеўданім, за чым стаіць і новае жыццё, і імкненне «наперад і наперад». Якраз тады па словах Ханны Мурайды пачаўся яе праект.

Выстава «Хваля» (зала НЦСМ — не першая пляцоўка, на якой экспазіцыя аказалася прадстаўленай) — гэта некалькі серый калажоў з паперы, архіўных і лічбавых фотаздымкаў, а таксама паларoідных. «Сусветны акіян», «Цунамі», «Прыліў», «Хвалі памяці». Гэта скрупулёзна пафарбаваная папера, падбор і сумяшчэнне розных колераў, месца разрыву паперы як рух вады, фотаздымкі невялікага фармату, няроўныя і рваныя лініі стыхіі і ў супрацьстаянне ім непарушныя прамыя. Выглядае прыгожа.

— Мой праект пачаўся як гульня. У той час, калі я займалася вялікімі формамі, пісала алеем, усё было вельмі сур'ёзна, паралельна крыху гуляла з паперай, — сказала на адкрыцці выставы аўтарка. — І мне вельмі спадабалася задавальненне ад разрывання паперы, якое сядзіць глыбока ў нас. У гэтай гульні з'явіўся прыём, потым пачаў расці праект, які складаецца з фотаздымкаў, паперы, дрэва — розных матэрыялаў. Для серыі «Сусветны акіян» мне трэба было крыху падрыхтавацца. Я прагледзела google maps, звярнула ўвагу на тое, што людзі здымаюць, калі гаворка ідзе пра акіян, якім ён бывае ў вачах іншых людзей, якія бываюць палітры колераў. Я фарбавала шмат лістоў паперы, сумяшчала іх. Атрымалася шмат работ, якія паказваюць, як мы бачым наш свет. Гэта праект аб прыродзе, людзях, пра мяне і пра ўражанні, якія мы адно на аднаго робім.

«Хваля» сапраўды не вылучаецца грандыёзнымі аб'ёмамі і манументальнасцю выканання. Якраз наадварот: праект выглядае настолькі ж стыхійным, як сам сусветны акіян; настолькі ж кампактным, як карты google maps, настолькі ж «душэўным», як асацыяцыі з морам.

Мастачка лічыць, калі абстрагавацца ад таго, на што мы глядзім, можна заўважыць, што мы бачым свет у круглым абадку — гэта абумовіла і форму пэўных работ. У нашага зроку, лічы, ёсць форма. І яна, дзякуючы колерам, архіўным фотаздымкам, тэме, адсылае да найпрыгажэйшых і, магчыма, самых дзіўных сваіх увасабленняў. Да самой планеты, непадуладных прыродных з'яў кшталту цунамі, да кола сяброў, да цыклічнасці, да колазвароту. І да спакою, ад якога не пазбавіцца на выставе і які так дысануе з уласна хваляй.

**Ірэна КАЦЯЛОВІЧ.**
*katsyalovich@zviazda.by*

## Наш Максім Багдановіч



# Яна — выдумка маёй галавы...

**«Каханне — апафеоз чалавечай красы», — сказала некалі мудра Люба Тарасюк. Таленавітая перадача ўласнага пачуцця ў творчасці, узвядзенне яго да маштабаў сусветнага, усеабдымнага — апафеоз творчасці. Безумоўна, геній Максіма Багдановіча не змог бы адбыцца без натхнення жаночымі вобразамі. Але хто яна была, тая недасяжная і чыстая, але ўсё ж такі зямная і пачуццёвая Багдановічава Мадонна?**

У якасці эпіграфа да сваёй славутай паэмы «Вераніка» Максім выбірае словы італьянскага паэта Джавані Праці «Яна — выдумка маёй галавы». Вядома, кожны паэтычны вобраз — выдумка і фантазія творцы. Аднак часта мае абсалютна рэальную жыццёвую аснову. Названы твор, як паэма «У вёсцы» ды іншыя выдатныя вершы, прысвечаны Ганне Какуевай, сястры Максімавага гімназісцкага сябра Рафаіла Какуева, «цёмнавокай панне». У вялікім доме Какуевых збіралася адукаваная моладзь, гучалі вершы, музыка, спевы. Бавілі час і ў гульнях, забавах. Разумная, таленавітая і прыгожая Ганна надоўга запала ў сэрца ўражліваму юнаку. У лісце да супрацоўнікаў «Нашай нівы» ад 7 лістапада 1913 г. Багдановіч пісаў: «На рэдакцыю «Н.Н.» пасылаю паэму «У вёсцы», першую з аддзела «Мадонны», гэты аддзел прысвячаю А. Р. К., так толькі буквы і пастаўце». У газеце аднак згаданыя ініцыялы надрукаваныя не былі... Хацеў Максім Багдановіч прысвяціць Ганне Какуевай нават асобны зборнік на рускай мове, пра што сведчаць радкі рукапісу да аднаго з вершаў планаванай нізкі: «Полынь-трава». Вершы пра А-ню Р-ну, з яе партрэтам і аўтографам, з каментарыямі да верша».

Але адкуль у паэта з'явілася імя Вераніка, своеасаблівы «псеўданім» яго каханай? Відавочна, што ў свядомасці Багдановіча вобраз жанчыны цэльны, ён успрымае прыгажосць кожнага перыяду яе жыцця (што яскрава праявілася ў яго паэтычнай нізцы «Каханне і смерць»). Уражваюць паэта праявы мацярынскага пачатку ў дзяўчынцы... Веранікай звалі маленькую пляменніцу яшчэ аднаго Максімавага таварыша па Яраслаўскай гімназіі, Дзіядора Дзябольскага, які ўспамінаў: «Для Максіма яна адразу ж стала не менш блізкай, чым для нас усіх. Ён заўсёды размаўляў з ёю, прынёс вялікі заалагічны атлас з малюнкамі звяроў. Гэтых звяроў яна падоўгу разглядала, седзячы на сваім высокім крэселку, і, калі прыходзіў Максім, гаварыла глыбокім шэптам: «Махім прыйшоў»... Імя Вераніка яму вельмі падабалася. Ад гэтай дзяўчынкі і назва яго паэмы «Вераніка». І тады ўжо ён пачаў шукаць і прымячаць у рысах і жэстах дзяўчынкі жаночае і мацярынскае. І ў гэтай паэме яму ўдалося стварыць вобраз дзяўчыны, якая

*Зіяючы перада мной*
*У новай пекнасці жывой,*
*У тэй,*
*што з постаццю дзяўчыны*
*Злівала мацеры чэрты.*

Пасля сканчэння гімназіі мы сустракаліся вельмі рэдка, таму, відавочна, і запомнілася, як вясною 1912 г. Максім, седзячы ў крэсле-качалцы, расказваў мне аб гэтым вобразе, што хваляваў яго, як пра яго, Максіма, адкрыццё і як пра загадку, што вабіць да сябе. Увогуле яго адносіны да жанчыны былі патаемна страсныя і рэдкасна чыстыя».

Прыкладам такога ж чыстага пачуцця была і сімпатыя Максіма Багдановіча да сваёй стрыечнай сястры Ганны Гапановіч. Менавіта для яе паэт здзейсніў пераклад 22 вершаў з «Вянка», якія ў выглядзе рукапіснага зборніка «Зеленя» ўручыў дзяўчыне з яскравым дароўным надпісам: «Переводы стихов — словно женщины: если красивы, то неверны, если верны, то некрасивы». Загадкавыя адносіны Максіма і Ганны хвалявалі родных, пра што сведчыць ліст стрыечнага брата паэта, Пятра Гапановіча, да сястры Веры аб намеры Максіма прыехаць у Ніжні Ноўгарад і пасяліцца ў іх доме: «Мяне ўзбударажыла задума М. І я не магу быць спакойным, пакуль ён не супакоіцца. З вас даволі, як няма куды, вашых звычайных клопатаў, а што тычыцца маёй сястры, якую я так люблю, дык я жадаў бы ёй лепшых паклоннікаў, калі ўжо без іх нельга». Ды толькі дарма хваляваліся... Пачуцці да Ганны Гапановіч і Ганны Какуевай засталіся ідэальнымі, узвышана-пачуццёвымі. Перашкодамі, натуральна, выступала і хвароба Багдановіча, і тэрытарыяльныя межы: Ганна Іванаўна з'ехала вучыцца ў Маскву на Вышэйшыя жаночыя курсы, Ганна Рафаілаўна — у кансерваторыю ў Пецярбург. Здаецца, толькі адно ўзаемнае і рэальнае каханне было ў жыцці паэта: летам 1915 г. падчас лячэння ў Крыме ён перажыў адносіны, што прынеслі шмат радасных і сумных дзён і, несумненна, таксама пакінулі адбітак на яго творчасці.

Драматычна, горка перажываў Максім Багдановіч адсутнасць свайго фізічнага працягу на зямлі:

*Больш за ўсё на свеце*
*жадаю я,*
*Каб у мяне быў свой*
*дзіцёнак —*
*Маленькая*
*дачушка-немаўляшка,*
*Аня Максімаўна,*
*Такая прыгожанькая,*
*Цёпленькая, мокранькая*
*З чорнымі валосікамі*
*і броўкамі,*
*З цёмна-карымі вочкамі,*
*А ручкі,*
*як перацягнутыя ніткамі.*
*Зусім такая, як Вы,*
*Калі Вы былі*
*маленькай дзяўчынкай.*

Аднак працяг вечны, творчы, неўміручы пакінулі ўсе яго гісторыі кахання. І сёння мы, узіраючыся ў начное неба, зноў і зноў задаёмся пытаннем: навошта нам «сваркі і звадкі, боль і горыч, калі ўсе мы разам ляцім да зор?»

**Юлія АЛЕЙЧАНКА.**

Максім Багдановіч

### ІЗНОЎ ПАБАЧЫЎ Я СЯЛІБЫ

Ізноў пабачыў я сялібы,
Дзе леты першыя прайшлі:
Там сцены мохам параслі,
Ўсё ў пылу. І стала мне
Так сумна, сумна ў цішыне.
Я ў сад пайшоў...
Ўсё глуха, дзіка,
Усё травою зарасло.
Няма таго, што раньш было,
І толькі надпіс «Вераніка»,
На ліпе ўрэзаны ў кары,
Казаў вачам аб тэй пары.
Расці, ўзмацовывайся, дрэва,
Як манумент жывы, ўставай
І к небу надпіс падымай.
Хай нерухомы словы спева:
Чым болі сходзіць дзён, начэй,
Тым імя мілае вышэй.



**КАЛІ на горад апускаюцца першыя прыцемкі, у вечаровым святле яшчэ больш выразна праступаюць абрысы старажытных будынкаў. Заціхае рух на ажыўленых удзень вуліцах, і толькі маленькі жалезны садоўнік (адна з фігурак, што ўпрыгожваюць вуліцы) па-ранейшаму спяшаецца, каціць свой вазок з кветкамі. Вы падумаеце, што ён развозіць кветкі, каб упрыгожыць горад да свята? Не. Ашмянскія вуліцы заўжды прыгожыя.**



**Яўген ПЯСЕЦКІ.**
**Фота аўтара.**